# Што будзе

**Гродзеншчына**

**17 сакавіка** Морынская сельская бібліятэка Іўеўскай ЦБС арганізуе літаратурны ранішнік "Падарожжа ў Чукоккалу" (да 130-годдзя з дня нараджэння К. Чукоўскага).

**19 сакавіка** бібліятэка-філіял № 6 г. Гродна сумесна з кінатэатрам "Усход" арганізуюць літаратурную віктарыну і прагляд мультфільмаў да 75-годдзя з дня нараджэння Э. Успенскага "Запрашаем у Прастаквашына".

**20 сакавіка** адкрыецца Тыдзень дзіцячай кнігі ў Верцялішкаўскай сельскай бібліятэцы — інфармацыйна-краязнаўчым цэнтры (Гродзенскі раён). На свята запрошаны гродзенскі дзіцячы паэт Віктар Кудлачоў. Для наведвальнікаў падрыхтавана выстаўка-агляд да юбілеяў Якуба Коласа і Янкі Купалы "З Сымонам-музыкам да новай зямлі".

**21 сакавіка** да Сусветнага дня паэзіі ў Рымдзюнскай сельскай бібліятэцы Астравецкай ЦБС пройдзе паэтычная вечарына "Чароўная краіна паэзіі". Яна рыхтуецца сумесна з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры Рымдзюнскай сярэдняй школы з беларускай мовай навучання.

**22 сакавіка** ў дзіцячым філіяле Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага пройдзе ўрачыстае адкрыццё Тыдня дзіцячай кнігі "Нам кніга свята падарыла". Праграма ўключае выступленні беларускіх пісьменнікаў У. Мазго, А. Кавалеўскага, Л. Кебіч, узнагароджанне пераможцаў літаратурна-творчага конкурсу "Мы з кнігаю сябруем".

**22 сакавіка** на сцэне Гродзенскага гарадскога Дома культуры адбудзецца свята, прымеркаванае да Тыдня дзіцячай кнігі, — "Кожны дзень у гасцях у кніжкі".

**23 сакавіка** Смаргонская гарадская бібліятэка № 2 плануе правесці вечар паэзіі да 75-годдзя з дня нараджэння рускай паэтэсы Бэлы Ахмадулінай.

**28 сакавіка** ў Трабскай сельскай бібліятэцы Іўеўскай ЦБС адбудзецца свята часопіса "Вясёлка", прысвечанае 55-годдзю з дня выхаду яго першага нумара.